УДК 37

# ПАТЭНЦЫЯЛ НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІКІ Ў ПАТРЫЯТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ СТУДЭНЦКАЙ МОЛАДЗІ

**І. І. Петрашэвіч[1], В. Ю. Рабцэвіч[2]**

[1] *Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна,*
*бульвар Касманаўтаў, 21, 224016, г. Брэст, Беларусь, i.i.petrashevich@gmail.com*
[2] *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4,*
*220030, г. Мінск, Беларусь, rabcevi@bsu.by*

У артыкуле прадстаўлены аналіз павышанай значнасці патрыятычнага выхавання студэнцкай моладзі ў сучаснай Рэспубліцы Беларусь. Цікавасць да праблемы дыктуе неабходнасць пошуку новых шляхоў і сродкаў, а таксама формаў арганізацыі патрыятычнага выхавання. Разглядаецца патэнцыял народнай педагогікі ў павышэнні якасці патрыятычнага выхавання студэнцкай моладзі ва ўмовах сучаснага адукацыйнага асяроддзя. Прыводзяцца прыклады шляхоў арганізацыі патрыятычнага выхавання сродкамі народнай педагогікі ў сучасным адукацыйным працэсе устаноў вышэйшай адукацыі.

***Ключавыя словы:*** народная педагогіка; патрыятычнае выхаванне; студэнцкая моладзь; выхаваўчы патэнцыял народнай педагогікі; Рэспукбліка Беларусь.

Актуальнае становішча рэчаў у нашай краіне, ды і ў свеце ў цэлым, патрабуе ад адукацыі перагляду ключавых пазіцый у галіне патрыятычнага выхавання студэнцкай моладзі. Патрыятычнае выхаванне студэнцкай моладзі ў цэлым накіравана на засваенне ёю агульначалавечых гуманістычных каштоўнасцей, культурных і духоўных традыцый свайго народа, ідэалогіі беларускай дзяржавы, фарміраванне гатоўнасці да выканання грамадзянскага абавязку і інш.

Патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення з’яўляецца стратэгічным рэсурсам развіцця грамадства. Шэраг нарматыўна-прававых дакументаў, зацверджаных і ўведзеных у дзеянне ў Рэспубліцы Беларусь, пацвярджаюць значнасць патрыятычнага выхавання, абгрунтоўваюць змястоўны бок арганізацыі выхаваўчай работы па патрыятычным выхаванні [4; 5; 7–10], актуалізуюць напрамкі і формы яго рэалізацыі.

Актуальнасць і значнасць патрыятычнага выхавання студэнцкай моладзі спараджае неабходнасць пошуку эфектыўных шляхоў яго рэалізацыі ў сучаснай адукацыйнай практыцы. На наш погляд, такім магутным і дзейсным патэнцыялам валодае менавіта народная педагогіка. Цікавасць да магчымасцяў народнай педагогікі ў патрыятычным выхаванні высокая.

Высока шанавалі значэнне народнай педагогікі і прадуктыўныя народныя ідэі ў выхаванні, прадставіўшы іх аналіз у сваіх працах, такія навукоўцы, як А. П. Арлова, Н. А. Бярдзяеў, У. І. Вадавозаў, В. А. Мікалаеў, Н. І. Пірагоў, Д. І. Пісараў, У. С. Салаўёў, В. А. Сухамлінскі, Н. Г. Чарнышэўскі, К. Д. Ушынскі, А. С. Хамякоў і інш.

Тым не менш патэнцыял народнай педагогікі ў патрыятычным выхаванні студэнцкай моладзі не вычарпаны, таму даследаванне магчымасцяў народнай педагогікі адкрывае ўсё новыя грані яе практычнай рэалізацыі ў адукацыйным працэсе.

Мы не ставім перад сабой мэту ў дадзеным артыкуле вызначыцца з паняццем і зместам патрыятычнага выхавання. Наша ўвага накіравана на вылучэнне і абгрунтаванне практычных шляхоў рэалізацыі сродкаў народнай педагогікі ў патрыятычным выхаванні навучэнскай моладзі.

Цікавасць уяўляе класіфікацыя сродкаў народнай педагогікі, прапанаваная В. А. Мікалаевым. Так, ён вылучае тры групы сродкаў народнай педагогікі:

1) матэрыяльныя сродкі (прырода, дзейнасць, прадметы побыту, прадметы працы, прадметы прыкладнога мастацтва і інш.);

2) духоўныя сродкі (слова, родная мова, фальклор, рэлігія, мастацтва, гульня і інш.);

3) сацыянарматыўныя сродкі (традыцыя, абрады, этыкет, грамадская думка і інш.) [6, с. 8].

На наш погляд, дадзеная класіфікацыя можа паслужыць асновай для вылучэння асноўных шляхоў рэалізацыі патрыятычнага выхавання ў адукацыйнай практыцы. У прыватнасці, мы вылучаем, у адпаведнасці з прыведзенай класіфікацыяй сродкаў народнай педагогікі, такія напрамкі ў працы, як:

- тэарэтычнае вывучэнне, абмеркаванне, асэнсаванне назапашанага народнага вопыту патрыятычнай накіраванасці (духоўныя сродкі – словы, родная мова, фальклор, рэлігія, мастацтва, гульня і інш.) і выкарыстанне яго ў паўсядзённай жыццядзейнасці;
- рэканструкцыя розных мерапрыемстваў патрыятычнай накіраванасці, у аснове якіх ляжаць народныя традыцыі, абрады, правілы этыкету і інш.;
- наведванне, жывое «перажыванне» і «сузіранне» матэрыяльнай спадчыны народнай педагогікі патрыятычнай накіраванасці (матэрыяльныя сродкі (прырода, дзейнасць, прадметы побыту, прылады працы, прадметы прыкладнога мастацтва і інш.).

Якія ж сродкі народнай педагогікі з'яўляюцца найбольш дзейснымі ў працы са студэнцкай моладдзю? Даволі цяжка адказаць на пастаўленае пытанне, бо ў гэтым выпадку варта ўлічваць не толькі такую агульную

прымету студэнцкай моладзі, як узрост. Найбольш абгрунтаваным пры выбары сродкаў народнай педагогікі ў патрыятычным выхаванні студэнцкай моладзі будзе, на нашу думку, улік наступных фактараў:

- прафесійная накіраванасць студэнтаў (абраная будучая прафесія);
- наяўнасць (або адсутнасць) схільнасці да творчых відаў дзейнасці;
- сацыяльнае становішча, нацыянальная прыналежнасць як самога студэнта, так і яго блізкіх;
- месца пражывання студэнта (у горадзе навучання або ў рэгіёне);
- псіхалагічныя і асобасныя асаблівасці студэнтаў;
- асобаснае прыняцце і ўспрыманне такіх формаў узаемадзеяння.

Строгія патрабаванні да абёму матэрыялаў не дазволяць нам разглядзець увесь спектр сродкаў народнай педагогікі. Таму мы прывядзём прыклады найбольш паказальных і дзейсных практык рэалізацыі сродкаў народнай педагогікі ў патрыятычным выхаванні студэнцкай моладзі ва ўмовах адукацыйнага асяроддзя ўстановы вышэйшай адукацыі.

Так, на наш погляд, найбольш дзейсным патэнцыялам у патрыятычным выхаванні студэнцкай моладзі валодаюць такія сродкі народнай педагогікі, як прырода, працоўнае выхаванне, народныя традыцыі.

Прырода – адзін з найважнейшых сродкаў народнай педагогікі. Для студэнта яна не толькі асяроддзе пражывання, але і родная старонка, Радзіма. Прырода роднага краю мае невытлумачальную ўладу над чалавекам. Патрыятызм – гэта, перш за ўсё, любоў да ўсяго таго, што акружае кожнага з нас, любоў да роднай прыроды [2, с. 6].

Этнаэкалагічнае выхаванне, на думку С. М. Ёлкіна, разумеецца ў педагагічнай навуцы як:

- далучэнне да духоўна-маральнай спадчыны і культуры свайго народа;
- фарміраванне цікавасці да прыроды роднага краю, фарміраванне сістэмы ведаў пра яе разнастайнасць, пра народныя звычаі і традыцыі;
- выхаванне эмацыянальна-каштоўнасных адносін да этнакультурнага і прыроднага асяроддзя і экалагічных паводзін з улікам узроставых асаблівасцей [3, с. 40].

Працоўнае выхаванне студэнцкай моладзі з’яўляецца найважнейшым абавязкам як бацькоў, так і ўстаноў адукацыі. Народ Беларусі, нашы продкі ў сваім гістарычным развіцці стварылі высокую педагагічную культуру, у якой перадача падрастаючаму пакаленню сацыяльна-маральнага вопыту папярэдніх пакаленняў ажыццяўлялася праз працу, добрасумленную сумесную стваральную дзейнасць дзяцей і дарослых. Роля працы зводзіцца не толькі да задавальнення матэрыяльных патрэб чалавека, але і да фарміравання сукупнасці рыс, якія спрыяюць гар-

манічнаму развіццю асобы. Без працы няма ні фізічнага, ні маральнага выхавання. Разам з тым без працы няма і паўнавартаснага разумовага выхавання.

Народныя традыцыі адносяцца да найбольш дзейсных сродкаў народнай педагогікі. Народныя традыцыі можна разумець як аб'ект і працэс сацыяльна-культурнай спадчыннасці. Яны акумулююць у сабе педагагічны вопыт многіх пакаленняў, што адлюстроўвае спецыфіку нацыянальнага выхавання. Звернуты ў будучыню, ён мае на мэце выкарыстанне раней атрыманых ведаў для арганізацыі жыцця сучасных пакаленняў.

Раней далучэнне моладзі да нацыянальнай культуры праходзіла натуральным шляхам: сама народная традыцыя забяспечвала неабходны ўзровень жыццёва-маральнай і мастацка-эстэтычнай выхаванасці маладога пакалення. Цяпер гэту традыцыю заклікалы падтрымліваць установы адукацыі, якія разам з сям'ёй, установамі культуры ствараюць эфектыўную сістэму ўваходжання моладзі ў свет нацыянальнай культуры.

Народныя традыцыі, на думку Н. В. Адаевай, развіваючы паважлівае стаўленне да звычаяў і традыцый продкаў, добразычлівасць у стасунках з іншымі людзьмі, нацыянальнае яднанне, маюць вялікі патэнцыял у патрыятычным выхаванні вучнёўскай моладзі [1, с. 41].

Такім чынам, прырода, працоўнае выхаванне і традыцыі валодаюць дзейсным патэнцыялам у патрыятычным выхаванні моладзі.

Асноўная мэта працоўнага выхавання – перадача моладзі вытворчых ведаў, уменняў і навыкаў, падрыхтоўка годнай змены. Пазнаючы традыцыі і звычаі, маладыя людзі становяцца захавальнікамі нацыянальнай самабытнасці. Глыбокае пазнанне традыцый пашырае кругагляд маладых людзей, развівае пачуццё грамадзянскай адказнасці, выхоўвае любоў да Радзімы.

Такім чынам, практыка паказвае, што адзіны шлях арыентацыі студэнцкай моладзі на агульначалавечыя каштоўнасці патрыятычнага выхавання ёсць нацыянальная культура, этнатрадыцыі, вывучэнне якіх дапамагае не толькі глыбока асэнсаваць гісторыю свайго народа, але і фарміраваць сваю грамадзянска-патрыятычную самасвядомасць.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС

1. *Адаева, Н. В.* Патриотическое воспитание средствами народной педагогики / Н. В. Адаева // Академический вестник Института педагогического образования и образования взрослых РАО. Человек и образование. – 2013. – № 1 (34). – С. 38–43.

2. *Волков, Г. Н.* Этнопедагогика: учеб. для студ. сред. и высш. пед. учеб. заведений / Г. Н. Волков. – М. : Издательский центр «Академия», 1999. – 129 с.

3. *Ёлкин, С. М.* Патриотическое воспитание детей средствами народной педагогики / С. М. Ёлкин // Вестник НовГУ. – 2017. – № 4 (102). – С. 39–42.

4. Закон Республики Беларусь от 5 октября 2022 г. № 205-З «Об изменении Закона Республики Беларусь «Об основах государственной молодежной политики» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://bsu.by/upload/All_units/dissertac.pdf. – Дата доступа: 07.10.2023.

5. Закон Республики Беларусь от 7 декабря 2009 г. № 65-З «Об основах государственной молодежной политики» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://bsu.by/upload/ZakonRB-ob-osnovah-gos-molo-politiki.pdf. – Дата доступа: 07.10.2023.

6. *Николаев, В. А.* Теория и методика формирования этнопедагогической культуры будущего учителя : дис. ... д-ра пед. наук : 13.00.01. / В. А. Николаев. – М., 1998. – 277 с.

7. Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 29 января 2021 г. № 57 «О Государственной программе “Образование и молодежная политика” на 2021–2025 годы» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://bsu.by/upload/gos-pr-obrazovanie-molod-politika-2021-2025.pdf. – Дата доступа: 07.10.2023.

8. Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 19 июня 2021 г. № 349 «О Стратегии развития государственной молодежной политики Республики Беларусь до 2030 года» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://bsu.by/upload/C22100349_1624395600.pdf. – Дата доступа: 07.10.2023.

9. Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 29 декабря 2021 г. № 773 «О Программе патриотического воспитания населения Республики Беларусь на 2022–2025 гг.» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://bsu.by/upload/All_units/dissertac/.pdf. – Дата доступа: 07.10.2023.

10. Программа непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи на 2021–2025 гг. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://bsu.by/upload/programma-vospitaniya-2021-2025.pdf. – Дата доступа: 07.10.2023.